# ОТ РЕДАКЦИИ
# EDITORIAL

У пачатку 2019 г. споўнілася 50 гадоў «Журналу Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика» – аднаму з самых прэстыжных навуковых выданняў нашай краіны. Выхад часопіса ў сакавіку 1969 г. пад назвай «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Серыя 4: Філалогія. Журналістыка» супаў па часе з кардынальнымі зменамі ў журналісцкай адукацыі: аднаўленнем факультэта журналістыкі пад кіраўніцтвам Р. В. Булацкага і фарміраваннем навуковых кірункаў шляхам стварэння кафедр (тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, гісторыі журналістыкі, радыё і тэлебачання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання). Пачэснае месца сярод чатырох серый часопіса заняла серыя «Філалогія. Журналістыка. Педагогіка», першым рэдактарам якой быў прызначаны прафесар М. Г. Булахаў (у 1965–1975 гг. узначальваў кафедру рускай мовы БДУ). Уся праца па падрыхтоўцы і выпуску часопіса праводзілася Выдавецтвам БДУ імя У. І. Леніна. У 1978 г. была створана пашыраная рэдакцыя выдання, у склад рэдкалегіі ўвайшлі вядомыя вучоныя і арганізатары беларускіх сродкаў масавай інфармацыі: А. Я. Супрун (галоўны рэдактар), М. П. Бараноўскі (адказны сакратар), М. А. Беразовін, Р. В. Булацкі, І. К. Германовіч, В. В. Казлова, Ф. І. Куляшоў, М. Р. Ларчанка, Б. П. Міцкевіч, Б. В. Стральцоў, Л. І. Фіглоўская, М. Я. Цікоцкі, Л. М. Шакун (намеснік галоўнага рэдактара), М. З. Яноўскі. У 1979 г. выданне мела афіцыйны адрас: універсітэцкі гарадок, юрыдычны факультэт (там жа размяшчаўся і факультэт журналістыкі), пакой № 62. Часопіс выходзіў на рускай і беларускай мовах, яго тыраж складаў 1115 экзэмпляраў.

З першых дзён свайго існавання выданне стала своеасаблівай візітнай карткай вядучага ўніверсітэта рэспублікі, а ў чацвёртай серыі атрымалі адлюстраванне найбольш значныя дасягненні айчыннай журналісцкай навукі. У першым нумары за 1969 г. былі змешчаны два артыкулы: «Друк, народжаны Кастрычнікам» Р. В. Булацкага і «Аб некаторых асаблівасцях зместу ленінскай публіцыстыкі» В. І. Дубовіка. У другім нумары за гэты ж год друкаваліся артыкулы М. С. Зярніцкага, А. А. Плаўнік, А. І. Раковіча і І. І. Сачанкі. На старонках трэцяга нумара за 1969 г. публікаваліся навуковыя даследаванні С. В. Говіна, В. І. Дубовіка і П. І. Ткачова.

Большасць публікацый гэтага перыяду была прысвечана гісторыі беларускай і рускай журналістыкі, але неўзабаве ў часопісе з’яўляецца ўсё больш навуковых даследаванняў, звязаных з практыкай тагачасных СМІ. Прыход на кафедры факультэта журналістыкі выкладчыкаў з практычным вопытам работы – Б. В. Стральцова, Е. Л. Бондаравай, Я. Р. Радкевіча, В. М. Шэйна і інш. – узбагаціў старонкі навуковага часопіса БДУ аналітычнымі публікацыямі аб дзейнасці газет, часопіснай перыёдыкі, радыё і тэлебачання.

За першыя пяць гадоў існавання выйшлі 15 нумароў выдання, даследчыкі апублікавалі на яго старонках 41 навуковы артыкул. У наступныя гады распрацоўкай гісторыі журналістыкі найбольш актыўна займаліся Е. Л. Бондарава, Р. В. Булацкі, В. І. Дубовік, А. Ф. Мяснікоў, А. І. Раковіч, А. Г. Слука, Б. В. Стральцоў. У навуковых артыкулах аналізаваліся праблемы тэорыі і практыкі СМІ, этапы развіцця беларускага радыё і тэлебачання, пытанні мовы, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, сродкі масавай інфармацыі замежных краін. За трыццаць гадоў выхаду часопіса (1969–1999) яго аўтары апублікавалі 192 навуковыя артыкулы, якія можна залічыць у залаты фонд айчыннай журналісцкай навукі.

«Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка» працягваў справу па фарміраванні навуковага патэнцыялу нацыянальнай журналістыкі і на пачатку XXI ст. Асабліва актывізавалася яго праца на мяжы 2005–2006 гг., калі факультэт журналістыкі ўзначаліў С. В. Дубовік, а намеснікам дэкана была прызначана В. М. Самусевіч. Галоўным рэдактарам часопіса ў той час быў В. Р. Рудзь, адказным рэдактарам – Н. Б. Мячкоўская, у склад рэдкалегіі ад факультэта журналістыкі ўваходзілі Т. Д. Арлова, Т. М. Дасаева, С. В. Дубовік, В. М. Самусевіч, Л. Д. Сінькова, Г. К. Тычко. Колькасць навуковых публікацый з 5–6 за каляндарны год вырасла больш чым утрая: у 2006 г. іх было 10, у 2007 г. – 18, у 2008 г. – 20, у 2009 г. –17, у 2010 г. – 23, у 2011 г. – 21. У 2016 г. у трох нумарах часопіса была апублікавана рэкордная колькасць прац айчынных і замежных даследчыкаў – 26! Навуковае кола аўтараў часопіса папоўнілі даследчыкі айчынных і замежных СМІ: Т. Д. Арлова, Г. І. Басава, В. П. Вараб’ёў, Т. М. Дасаева, С. В. Дубовік, А. А. Градзюшка, В. І. Іўчанкаў, Т. У. Падаляк, Л. П. Саянкова-Мяльніцкая, І. У. Сідорская,

Л. Д. Сінькова, У. А. Сцяпанаў, Н. Т. Фральцова, С. В. Харытонава, В. І. Шымолін і інш. Рупліўцы навуковай журналісцкай нівы з 2000 па 2018 г. надрукавалі ў выданні 302 артыкулы, а з улікам папярэдняга трыццацігоддзя агульная колькасць публікацый, змешчаных у 175 нумарах часопіса, дасягнула 494.

З 2017 г. часопіс змяніў сваю назву на «Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика» і пачаў выходзіць два разы на год. Імклівае развіццё СМІ Рэспублікі Беларусь, стварэнне новых журналісцкіх спецыяльнасцей і навуковых кірункаў прывялі да з'яўлення ў часопісе тэматычных рубрык: «История журналистики», «Теория и практика современной журналистики», «Медиалингвистика», «Культурные стратегии в медиапространстве», «Веб-журналистика и медиалогия», «Современные медиакоммуникации», «Тэлевізійная журналістыка», «Теория и практика зарубежных СМИ» і інш.

Сёння рэдактарам часопіса з'яўляецца дэкан факультэта журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. М. Самусевіч, намеснікам рэдактара – загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, доктар педагагічных навук, прафесар В. Л. Жук, адказным сакратаром – загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л. П. Саянкова-Мяльніцкая. Часопіс уключаны Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь у Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па філалагічных і педагагічных навуках і бібліяграфічную базу даных навуковых публікацый «Российский индекс научного цитирования» (РИНЦ), мае сваю электронную версію, уваходзіць у кагорту самых аўтарытэтных навуковых універсітэцкіх выданняў у СНД і краінах Захаду.

Віншуем аўтараў і чытачоў часопіса з 50-гадовым юбілеем навуковага ўніверсітэцкага выдання! Жадаем далейшых творчых поспехаў і дасягненняў на ніве айчыннай журналісцкай навукі.

***П. Л. Дарашчонак***[1]

[1]*Пётр Леонидович Дорощёнок* – кандидат филологических наук; доцент кафедры медиалогии факультета журналистики Белорусского государственного университета.

*Пётр Леанідавіч Дарашчонак* – кандыдат філалагічных навук; дацэнт кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Piotr L. Darashchonak*, PhD (philology); associate professor at the department of medialogy, faculty of journalism, Belarusian State University.

E-mail: *pdoroshhyonok@mail.ru*